XI Міжнародны з'езд славістаў

Даклады

КАНСТАНЦІН КАБАШНІКАЎ

НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ТЭРМІНАЛОГІІ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»

1993

XI Міжнародны з'езд славістаў

Дакладзі

КАНСТАНЦІН КАБАШНІКАЎ

НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ТЭРМІНАЛОГІІ

ФАЎПКЛЮРЫСТЫКІ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАЙ

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1993

АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Беларускі камітэт славістаў

КАНСТАНЦІН КАБАШНІКАЎ

НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ТЭРМІНАЛОГІІ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1993

УДК [881.09+398(=81)] : 801.316.4

4600000000—099
К———————зак. выд.— 93
М 316(03)—93

ISBN 5-343-01464-X

© Канстанцін Кабашнікаў,
1993

У развіцці навукі істотную ролю адыгрывае тэрміналогія. Яна замацоўвае вынікі тэарэтычных пошукаў, садзейнічае ўкараненню ў даследчую практыку уніфікаванага навуковага інструментарыя, дазваляе суадносіць з'явы і паняцці, якія даследуюцца паслядоўнікамі розных навуковых школ і напрамкаў. Распрацаванасць тэрміналогіі — важны паказчык тэарэтычнага ўзроўню канкрэтнай навукі.

Усходнеславянская фальклярыстыка мае багатую гісторыю, сваіх выдатных прадстаўнікоў, чые працы з'явіліся крыніцай нацыянальных і агульных — усходнеславянскіх — тэрмінаў. Варта, аднак, заўважыць, што фальклярыстычная тэрміналогія — дынамічная сістэма, у якой пастаянна адбываюцца змены: побач з адміраннем устарэлых і ўвядзеннем новых тэрмінаў мы назіраем і пераасэнсаванне некаторых з іх, набыццё імі новых значэнняў. На фарміраванне тэрміналагічнага апарату фальклярыстыкі моцна ўплывалі асаблівасці развіцця гэтай навукі, якая, перш чым аформілася ў самастойную дысцыпліну, існавала ў шырокіх межах народазнаўства, этнаграфіі, гісторыі славеснасці і карысталася іх тэрміналогіяй. Ды і зараз, маючы шмат кропак судакранання з літаратуразнаўствам, мовазнаўствам, этнаграфіяй, гісторыяй, рознымі галінамі мастацтвазнаўства, фальклярыстыка шырока ўжывае тэрміналогію гэтых навук, хаця, натуральна, мае і сваю ўласную спецыфічную тэрміналагічную сістэму. Істотны ўплыў на фарміраванне тэрміналагічнага апарату фальклярыстыкі аказвалі як розныя навуковыя напрамкі, асабліва тыя, што мелі міжнародны характар, так і палітычная кан'юнктура, якая адбівалася на распаўсюджанні розных падыходаў да з'яў народнай творчасці, у тым ліку вульгарна-сацыялагічных. Усе адзначаныя фактары ўздзейнічалі на фарміраванне тэрміналогіі ў беларускай, рускай, украінскай фальклярыстыцы, але інтэнсіўнасць уплыву кожнага з іх была неаднолькавай.

Апошнім часам ва ўсходнеславянскай фальклярыстыцы ўсё больш адчувалася патрэба ў сістэматызацыі і навуковым асэнсаванні назапашанага за паўтара стагоддзя тэрміналагічнага апарату, у яго аналізе і уніфікацыі. Асабліва востра гэта праблема паўстала ў сувязі з пашырэннем параўнальных даследаванняў у галіне ўсходнеславянскага і славянскага фальклору. Узнікла неабходнасць вызначыць, наколькі дакладна суадносіцца прынятая сёння ў беларускай, рускай і ўкраінскай фальклярыстыцы тэрміналогія, у якой ступені ёй можна карыстацца як агульным інструментам навуковага даследавання. Да таго ж перагляд адносін да спадчыны, які ў сувязі з дэмакратызацыяй грамадства адбываецца ва ўсіх галінах навукі і культуры, не абмінуў і фальклярыстыку, выклікаўшы неадназначныя адносіны даследчыкаў да шэрагу тэрмінаў, узнікшых у апошнія семдзесят гадоў.

Гэтыя і іншыя акалічнасці паставілі перад фальклярыстамі Беларусі, Расіі і Украіны задачу стварэння слоўніка фальклорных тэрмінаў трох усходнеславянскіх народаў. Намаганнямі Усходнеславянскай секцыі Камісіі славянскага фальклору пры Міжнародным камітэце славістаў, Навуковага савета АН Расіі па фальклору, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, які выступаў у якасці галаўной установы, Інстытута мастацтвазнаўства, фальклору і этналогіі АН Украіны, супрацоўнікаў кафедр фальклору буйнейшых ВНУ Беларусі, Расіі і Украіны такі слоўнік быў створаны [1].

У працы над ім акрэслілася кола разнастайных праблем, у тым ліку і тэарэтычных. Адны з іх знайшлі сваё вырашэнне ў артыкулах Слоўніка, другія былі толькі ўзняты, і трактоўка іх застаецца дыскусійнай, трэція могуць быць сфармуляваны і разгледжаны на тых багатых і разнастайных матэрыялах, якія сабраны ў працы. Звяртаючыся да некаторых з гэтых праблем, мы будзем абапірацца на розныя крыніцы, але перш за ўсё на матэрыялы, сабраныя ў Слоўніку.

---

[1] Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии / Ред. коллегия: Г. А. Барташевич, В. М. Гацак, В. Е. Гусев, К. П. Кабашников, А. С. Федосик, Н. С. Шумада (рукапіс знаходзіцца ў друку).

* * *

Параўнальны аналіз тэрміналогіі ўсходнеславянскай фальклярыстыкі мае пад сабой трывалы грунт. Перш за ўсё гэта сам фальклор рускага, беларускага і ўкраінскага народаў, які мае шмат агульных рыс у жанравым складзе, вобразнай сістэме, паэтыцы, што абумоўлена генетычнай роднасцю і пастаяннымі кантактнымі сувязямі, а таксама роднасць моў. Вялікую ролю адыгралі тут асаблівасці развіцця фальклярыстыкі, якая ў кожнага з гэтых народаў прайшла аднолькавыя этапы, адчула ўздзеянне адных навуковых ідэй, тэорый, напрамкаў. Большасць буйных усходнеславянскіх фальклярыстаў, пачынаючы з З. Даленгі-Хадакоўскага, вывучалі не толькі свой нацыянальны фальклор, але і фальклор сваіх суседзяў; навуковыя цэнтры і таварыствы Вільні, Масквы, С.-Пецярбурга, Кіева, а таксама многія часопісы, што выдаваліся тут, цікавіліся творчасцю кожнага з усходнеславянскіх народаў. Усё гэта прыводзіла да выпрацоўкі агульнай тэрміналогіі, якая паўсюдна замацоўвалася дзякуючы працам такіх аўтарытэтных вучоных, як Ф. І. Буслаеў, А. М. Весялоўскі, Я. Ф. Карскі, І. Франко, А. Патабня і многія іншыя.

Разам з тым, маючы агульную аснову, кожная нацыянальная тэрміналогія павінна была адлюстроўваць і адлюстроўвала спецыфічныя рысы сваёй народнай творчасці, акумулюючы не толькі навуковыя, але і народныя тэрміны, многія з якіх замацаваліся ў навуковым ужытку. Дарэчы, якраз у народнай тэрміналогіі найбольш поўна адлюстроўваюцца нацыянальныя і рэгіянальныя асаблівасці фальклору, пераважна на ўзроўні жанравых сістэм, і з гэтага пункту гледжання яна дае каштоўнейшы матэрыял для параўнальных даследаванняў.

Каб перайсці да разгляду канкрэтных пытанняў, якія вынікаюць з сённяшняга стану ўсходнеславянскай фальклярыстычнай тэрміналогіі, мэтазгодна, відаць, хаця б умоўна правесці сістэматызацыю гэтага матэрыялу. Відавочна вылучаецца пэўны блок тэрмінаў, якія звязаны з тэарэтычнымі паняццямі і ахопліваюць азначэнне фальклору, яго спецыфічныя рысы, фальклярыстыку і сумежныя дысцыпліны, методыку і метадалогію фальклярыстыкі, фальклярыстычныя школы, тэорыі і напрамкі і г. д. Другім буйным блокам з'яўляецца блок

тэрмінаў, якія датычаць відаў, жанраў і жанравых разнавіднасцей усходнеславянскага фальклору. Асобна вылучаюцца тэрміны, якія раскрываюць асаблівасці паэтыкі і стылістыкі, выканаўства, а таксама спецыфічныя тэрміны музычнага, харэаграфічнага і драматычнага фальклору.

Першы блок найбольш інтэрнацыяналізаваны, аб'яднаныя ў ім тэрміны трывала ўвайшлі ў фальклярыстыку ўсходнеславянскіх народаў, хаця не ўсе яны ўжываюцца аднолькава інтэнсіўна і не заўсёды маюць аднолькавую інтэрпрэтацыю. Але найбольш складаная сітуацыя з тэрмінамі палітызаванымі, заідэалагізаванымі, якія атрымалі ў свой час шырокае распаўсюджанне, а зараз выклікаюць крытыку і нават іх непрынятце з боку асобных фальклярыстаў.

Некалькі заўваг адносна тэрмінаў, якія па-рознаму трактуюцца і ўжываюцца ў даследаваннях. Ужо асноўны тэрмін «фальклор» і ў мінулым і сёння ва ўсходнеславянскай навуковай традыцыі, ды і не толькі ў ёй, не мае адназначнага тлумачэння. Прапанаваны ў сярэдзіне мінулага стагоддзя Вільямам Томсам гэты тэрмін не адразу быў успрыняты ўсходнеславянскай фальклярыстыкай, у якой да першых двух дзесяцігоддзяў XX стагоддзя пераважалі тэрміны «вусная славеснасць», «народная славеснасць», «народная паэзія», неадэкватныя па сваёй сутнасці тэрміну, прапанаванаму англійскім вучоным. Традыцыя вузкага разумення тэрміна «фальклор» захавалася і тады, калі ён у нашым ужытку паступова выцясняў вышэйпрыведзеныя тэрміны. Як пісаў у сваім падручніку Ю. М. Сакалоў, «пад фальклорам трэба разумець вусную паэтычную творчасць шырокіх народных мас»[2]. Нягледзячы на тое што гэты тэрмін у падобнай трактоўцы не адпавядаў ні яго літаральнаму значэнню, ні тым азначэнням фальклору, якія двойчы фармулявала камісія экспертаў ЮНЕСКА[3], ён і зараз

---

[2] Соколов Ю. М. Русский фольклор. М., 1941. С. 6.

[3] Азначэнне, прынятае Камітэтам урадавых экспертаў па захаванню фальклору пры ЮНЕСКА ў 1985 годзе і ўдакладненае ў рэкамендацыях Генеральнай канферэнцыі ў кастрычніку—лістападзе 1989 года: «Фальклор (або традыцыйная і народная культура) — ёсць сукупнасць заснаваных на традыцыях культурнага супольніцтва твораў, выказаных групай або індывідуумамі і прызнаных у якасці адлюстравання надзей грамадства, яго культурнай і сацы-

у многіх працах беларускіх, рускіх і ўкраінскіх фальклярыстаў захоўвае той сэнс, які яму надаваў Сакалоў, з чым мы не раз сутыкаліся, рыхтуючы Слоўнік. Але побач з гэтым усё большае пашырэнне знаходзіць разуменне фальклору як мастацкай творчасці народа, як народнага мастацтва ў сукупнасці яго відаў: паэтычнага, музычнага, драматычнага, харэаграфічнага, дойлідства, выяўленчага, прыкладнога. Хаця такое азначэнне некалькі вузей прынятага ЮНЕСКА, яно, на наш погляд, найбольш прыдатнае і захоўвае за фальклорам пэўную спецыфіку і тую мяжу, якая аддзяляе яго ад этнаграфіі і іншых галін народазнаўства. У артыкуле «Фальклор» Слоўніка В. Я. Гусеў падкрэслівае, што ў сучаснай усходнеславянскай фальклярыстыцы пераважае разуменне фальклору як сацыяльна абумоўленай формы творчай дзейнасці народных мас, якая гістарычна развіваецца і характарызуецца сістэмай спецыяльных адзнак. Канкрэтызуючы змест паняцця «фальклор» і яго блізкага адпаведніка «творчасць народная», Слоўнік вылучае творчасць славесную (вусную), выяўленчую, драматычную, музычную, харэаграфічную.

Існаванне розных поглядаў на аб'ём паняцця «фальклор» ва ўсходнеславянскай фальклярыстыцы прыводзіць да неадэкватнага яго ўжывання ў розных працах. Па традыцыі яшчэ нярэдка за тэрмінам «фальклор» захоўваецца яго філалагічны сэнс, а каб адрозніць іншыя віды народнага мастацтва, дадаюцца азначэнні: «фальклор музычны», «фальклор харэаграфічны». Гэта стварае пэўныя нязручнасці, неабходнасць размяжоўваць і тлумачыць шырокае і вузкае разуменне тэрміна. Выйсцем са становішча было б унармаванае ўжыванне складанага тэрміна «славесны фальклор» (па аналогіі з «музычны фальклор», «харэаграфічны фальклор»), або «вуснапаэтычная творчасць», а тэрмін «фальклор» ужываць толькі ў яго шырокім разуменні.

У апошнія дзесяцігоддзі значных поспехаў дасягнула гісторыка-тыпалагічнае вывучэнне фальклору дзякуючы перш за ўсё працам В. М. Жырмунскага, Б. М. Пуціла-

---

яльнай самабытнасці; фальклорныя ўзоры і каштоўнасці перадаюцца вусна, шляхам імітацыі ці іншымі спосабамі. Яго формы ўключаюць, у прыватнасці, мову, літаратуру, музыку, танцы, гульні, міфалогію, абрады, звычаі, рамёствы, архітэктуру і іншыя віды мастацкай творчасці».

ва і некаторых іншых даследчыкаў. Распрацоўваючы методыку і метадалогію параўнальных даследаванняў, вучоныя павінны былі пашырыць тэрміналагічны апарат ці выкарыстоўваць старыя тэрміны, напаўняючы іх новым зместам або ўдакладняючы яго. В. М. Жырмунскі ў дакладзе на IV Міжнародным з'ездзе славістаў «Эпічная творчасць славянскіх народаў і праблемы параўнальнага вывучэння эпасу», разглядаючы метадалагічныя і метадычныя прынцыпы параўнальных даследаванняў, сфармуляваў шэраг палажэнняў, якія былі падтрыманы і атрымалі далейшае развіццё. Ён падкрэсліваў, што параўнанне — выяўленне падабенства і адрозненняў паміж гістарычнымі з'явамі і гістарычнае іх тлумачэнне — з'яўляецца методыкай, інструментам навуковага даследавання, у аснове якога заўсёды ляжыць пэўны метад, абумоўлены тэарэтычнымі канцэпцыямі пэўнай навуковай школы, напрамку. Сярод чатырох аспектаў параўнальна-гістарычнага даследавання В. М. Жырмунскі вылучаў «параўнанне гісторыка-тыпалагічнае, якое тлумачыць падабенства генетычна паміж сабой не звязаных з'яў падобнымі ўмовамі грамадскага развіцця» [4].

Погляд В. М. Жырмунскага на гісторыка-тыпалагічнае параўнанне як на адну з магчымых заканамернасцей, што абумоўлівае падабенства фальклору, падзяляюць В. Я. Гусеў і іншыя вучоныя. Шырэй на гісторыка-тыпалагічнае вывучэнне глядзіць Б. М. Пуцілаў. «Гісторыка-тыпалагічныя сувязі і адносіны,— піша даследчык,— дзейнічаюць на працягу ўсяго гісторыка-фальклорнага працэсу і ахопліваюць усе яго бакі. Яны маюць універсальны, пастаянны і бесперапынны характар. Яны з'яўляюцца ў адносінах да ўсіх іншых відаў сувязей вызначальнымі, дамінантнымі» [5]. Мае месца і зусім вузкае разуменне тыпалогіі як сукупнасці рыс, якія характарызуюць пэўную з'яву і па гэтых тыповых рысах дазваляюць вылучыць яе з шэрагу іншых з'яў або, наадварот, суаднесці з падобнымі. У гэтым выпадку тэрмін «тыпалогія» па свайму зместу набліжаецца да паняцця

---

[4] Жирмунский В. М. Эпическое творчество славянских народов и проблемы сравнительного изучения эпоса. М., 1958. С. 7.

[5] Путилов Б. Н. Методология сравнительно-исторического изучения фольклора. Л., 1978. С. 15.

«спецыфіка» (параўн.: «тыпалогія навелістычнай казкі» і «спецыфіка навелістычнай казкі»).

На жаль, існаванне розных поглядаў на сутнасць тыпалогіі, гісторыка-тыпалагічнага параўнання, тыпалагічнага падабенства пакуль што не знайшло свайго ўвасаблення ў тэрміналогіі ўсходнеславянскай фальклярыстыкі, і сёння за гэтымі тэрмінамі могуць стаяць розныя падыходы, розныя, калі не супрацьлеглыя, пазіцыі — ад разумення іх як катэгорый метадалагічнага плана да прыватнай методыкі даследавання. Артыкулы Слоўніка «Вывучэнне фальклору тыпалагічнае», «Метад гісторыка-тыпалагічны», «Метад структурна-тыпалагічны», «Тыпалогія ў фальклоры», «Пераемнасць тыпалагічная», напісаныя Б. М. Пуцілавым, даюць магчымасць прасачыць ужыванне тэрміна «тыпалогія» і яго вытворных, іх значэнне. Адлюстроўваючы пазіцыю аўтара, яны ў той жа час не пакідаюць без увагі і іншых падыходаў, іншага разумення праблемы і звязанай з ёй тэрміналогіі.

Навуковы апарат усходнеславянскай фальклярыстыкі істотна змяніўся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. З аднаго боку, выходзілі з навуковага ўжытку тэрміны тыпу «хрысціянскі эпас», звужалася сфера бытавання тэрмінаў «духоўныя вершы», «псалмы», бо самі гэтыя творы апынуліся амаль што пад забаронай. З другога — узнікла шмат тэрмінаў, якія непасрэдна або апасродкавана адлюстроўвалі размежаванне, што адбывалася ў грамадстве, у ідэалогіі, у навуцы, у народнай творчасці. Сапраўды, 1917 год стаў той мяжой, якая перапыніла натуральны ход падзей, пэўную пераемнасць, што існавала ў навуцы. У адпаведнасці з афіцыйнымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі неабходна было адлюстраваць і замацаваць гэты падзел і ў народным мастацтве, і ў фальклярыстыцы, супрацьпаставіць мінулае, якое звычайна ацэньвалася негатыўна, і сучаснае, у якім бачылася толькі станоўчае, перадавое, прагрэсіўнае. Так увайшлі ў фальклярыстыку тэрміны «дарэвалюцыйны фальклор» і «савецкі фальклор», «дарэвалюцыйная фальклярыстыка» і «савецкая фальклярыстыка», «буржуазная фальклярыстыка» і «марксісцка-ленінская фальклярыстыка» і многія іншыя.

Зараз на моцнай хвалі пераацэнак нашай гісторыі выявілася тэндэнцыя да перагляду гісторыі навукі і яе

навуковага апарату, адмаўленне ад многіх тэрмінаў, узнікшых у савецкі час. Яна досыць актыўна праявілася і ў ходзе працы над Слоўнікам, асабліва пры абмеркаванні на розных узроўнях яго складу. Неабходнасць перагляду гісторыі народнай творчасці і гісторыі навукі аб ёй бясспрэчная. У той жа час гэта павінен быць сапраўды навуковы перагляд, а не простае адмаўленне мінулага ці, што ў нас ужо было, яго забарона. Прыгаданыя вышэй і многія ім падобныя тэрміны сапраўды ўвайшлі ў навуковы ўжытак, яны сустракаюцца не толькі ў навуковых даследаваннях, але і ў вучэбных праграмах і падручніках, якія выдаваліся да апошняга часу, і іх трэба не выкрэсліваць, а паказаць, што за імі стаіць, і даць адпаведную ацэнку гэтым паняццям і з'явам.

Тэрміны «дарэвалюцыйны фальклор» і «савецкі фальклор» адлюстравалі той водападзел, які сапраўды ўтвараўся ў развіцці ўсходнеславянскай народнай творчасці. Першы з іх абдымае, па сутнасці, усю фальклорную спадчыну, якая стваралася на працягу шэрагу эпох, што папярэднічалі 1917 году. У ёй найбольш поўна і паслядоўна праяўляюцца такія ўласцівасці фальклору, як калектыўнасць, традыцыйнасць, вуснасць, варыятыўнасць, прадстаўлены ўсе віды і жанры народнай творчасці славян, яна застаецца важнай часткай сучаснай народнай культуры. Тэрмін «дарэвалюцыйны фальклор» успрымаецца перш за ўсё як адно з абазначэнняў тых храналагічных межаў, без уліку якіх немагчымы сапраўды навуковы гістарычны падыход да даследавання народнай творчасці. І хаця ў сэнсе гістарычным ён не зусім акрэслены, таму што ахоплівае некалькі эпох, адзін з рубяжоў ён вызначае дакладна. Другі тэрмін «савецкі фальклор» таксама мае храналагічнае адценне і абазначае пэўны гістарычны перыяд у развіцці народнай творчасці, але значэнне яго больш шырокае. За ім бачацца і тыя прынцыпова якасныя змены, якія адбываліся ў гэты гістарычны перыяд у фальклоры. Таму перш за ўсё тэрмін «савецкі фальклор» абазначае з'яву, вакол якой ішло шмат спрэчак і дыскусій [6]; яны многае далі для высвятлення яе сут-

[6] Пачатак дыскусій можна аднесці да публікацый у «Новом мире» артыкулаў «Затылком к будущему» і «Волхвование и шаманство» М. Лявонцьева (1948 і 1953 гг.). Затым былі вострыя спрэчкі на канферэнцыях у Кіеве (1961) і Ноўгарадзе (1970) і ў друку.

насці, але не вырашалі праблему цалкам. Удзельнікі дыскусій звярталі ўвагу на змяншэнне колькасці прадукцыйных жанраў, на пэўныя змены ў фальклорным працэсе, у прыватнасці на павелічэнне ролі індывідуальнага пачатку, на ўзмацненне ўплыву на фальклор літаратуры і прафесійнага мастацтва. Асабліва падкрэсліваліся карэнныя адрозненні ў ідэйна-тэматычным змесце, шырыня тэматыкі новых твораў, іх цесная сувязь з рэчаіснасцю, адлюстраванне новага светапогляду савецкіх людзей і г. д. Аднак кардынальна вырашыць праблему ў тыя часы было немагчыма з-за жорсткага ідэалагічнага кантролю, пад якім знаходзілася ўсё духоўнае жыццё краіны. Спрачаючыся пра сутнасць і спецыфіку сучаснага (савецкага) фльклору, вучоныя маглі абапірацца толькі на частку народнай творчасці, добра прафільтраваную, якая адпавядала па свайму зместу і ідэалагічнай накіраванасці афіцыйнай палітыцы. Другая ж і даволі значная частка фальклорных твораў, якая не адпавядала афіцыйным устаноўкам і нават супрацьстаяла ім, была пад забаронай і не ўключалася ў даследаванні. У выніку характарыстыка ідэйнага зместу «савецкага фальклору», яго жанравага складу і некаторых іншых параметраў аказалася аднабаковай, няпоўнай, тэндэнцыйнай, хаця сама гэта з'ява існавала. Таму, відаць, справа не ў тым, каб адкінуць гэты тэрмін (хаця не выключана, што ён можа быць заменены, калі гісторыкі знойдуць новую назву перыяду грамадскага развіцця краіны пасля 1917 года) і ўсё, што за ім стаіць, а ў тым, каб вызначыць яго сапраўдны змест.

Прыкладна такая ж сітуацыя ўзнікла з тэрмінамі «дарэвалюцыйная фальклярыстыка» і «савецкая фальклярыстыка». Першы ахоплівае ўсе напрамкі і школы, якія існавалі ў дарэвалюцыйны час, уключаючы сюды і так званую «перадгісторыю навукі» — першыя публікацыі фальклору ў літаратурных помніках, гістарычных дакументах і да т. п. Другі храналагічна пачынаецца з 1917 года, але мяжа гэта фармальная. Звычайна пад «савецкай фальклярыстыкай» разумелася навука, якая стаяла на грунце марксісцка-ленінскай метадалогіі. Аднак спасціжэнне асноў гэтай метадалогіі і практычная іх рэалізацыя адбываліся па-рознаму. У адных выпадках усё зводзілася да цытацыі класікаў марксізма-ленінізма і каментарыяў да цытат, да начотніцтва, якое з

сапраўднай навукай не мела нічога агульнага. У другіх — даследчыкі авалодвалі асноўнымі ідэямі гегелеўскай дыялектыкі і гістарычнага матэрыялізму і з гэтых пазіцый досыць плённа аналізавалі фальклор. У іншых сітуацыях вучоныя, працягваючы традыцыі той ці іншай фальклорнай школы, час ад часу рабілі спасылкі на працы класікаў або цытавалі іх, калі гэта не пярэчыла іх канцэпцыям, што ратавала ад папрокаў у «безыдэйнасці». На жаль, у фальклярыстыцы ўсходніх славян пакуль што няма гістарыяграфічных прац, якія б стварылі аб'ектыўны малюнак развіцця навукі ў гэты час, паказалі б яе метадалагічныя асаблівасці, асноўныя тэорыі і школы, якія, як добра вядома, пакінулі след не толькі ў айчыннай, але і ў замежнай навуцы. Пакуль што мы можам канстатаваць, што за тэрмінам «савецкая фальклярыстыка» стаяць не толькі і не столькі храналагічныя межы, колькі складаны і супярэчлівы працэс развіцця навукі, які чакае сваіх даследчыкаў.

У цеснай сувязі з апошнім тэрмінам знаходзяцца тэрміны «буржуазная фальклярыстыка» і «марксісцка-ленінская фальклярыстыка». Тэрмін «буржуазная фальклярыстыка» не можа лічыцца строга навуковым. У яго аснове — ідэя аб класавым (буржуазным, дваранскім, рабочым, сялянскім) характары навукі, аб абароне ёю інтарэсаў пэўнага класа, што супярэчыць галоўнаму патрабаванню да навукі — аб'ектыўнасці вывадаў. Да «буржуазнай фальклярыстыкі», таксама як і да «буржуазнай навукі», «буржуазнай філасофіі», адносілі звычайна ўсё тое, што не адпавядала гісторыка-матэрыялістычнай канцэпцыі развіцця грамадства і яго духоўнай культуры. Гэта маглі быць працы прадстаўнікоў айчыннай фальклярыстыкі (у асноўным дарэвалюцыйнай), а таксама замежных вучоных. Так, М. К. Азадоўскі, адзначаючы пэўны спад навуковай фальклярыстычнай думкі ў канцы 80-х гадоў XIX стагоддзя, пісаў: «Гэта — вынік паніжэння агульнага тэарэтычнага ўзроўню буржуазнай навукі, як заходняй, так і рускай...»[7] Аднак у той час, як і М. К. Азадоўскі, і Ю. М. Сакалоў, і У. І. Чычараў, і некаторыя іншыя даследчыкі, карыстаючыся гэтым тэрмінам і яго вытворнымі, адчувалі

[7] Азадовский М. К. История русской фольклористики. М., 1963. Т. 2. С. 284.

недакладнасць, неакрэсленасць і імкнуліся, калі размова ішла пра пэўных вучоных, навуковыя тэорыі і напрамкі, даць больш канкрэтную характарыстыку іх навуковых поглядаў ці філасофскай асновы тэорыі, многія фалькларысты не абцяжарвалі сябе такой задачай і ўжывалі тэрмін як ацэначна-негатыўны.

Недакладнасць і неакрэсленасць тэрміна, яго непрыхаваная палітызаванасць робяць немэтазгодным яго далейшае ўжыванне.

Сутнасць паняццяў «фальклярыстыка марксісцкая», «фальклярыстыка марксісцка-ленінская» неаднойчы разглядалася ў спецыяльных працах і артыкулах [8], аўтары якіх паказваюць зараджэнне гэтага напрамку ў еўрапейскай і ўсходнеславянскай фальклярыстыцы, яго месца ў развіцці навукі, асноўную праблематыку. У Слоўніку яму прысвечаны артыкул В. Я. Гусева. З фальклярыстыкай марксісцкай звязваецца распрацоўка праблемы паходжання мастацтва, яго ранніх форм і гістарычнай абумоўленасці (лёс эпасу), сацыяльных функцый, адлюстравання ў фальклоры супярэчнасцей, уласцівых светапогляду яго стваральнікаў, і г. д. Яна спрыяла таму, што ва ўсходнеславянскай фальклярыстыцы трывала ўсталяваўся гістарычны падыход да розных з'яў духоўнага жыцця; развіццё фальклору разглядаецца ва ўзаемасувязі з працоўнай, сацыяльнай і іншымі сферамі дзейнасці чалавека; народная творчасць успрымаецца як дынамічная сістэма. Але разам са станоўчым гэты навуковы напрамак меў нямала негатыўнага, што звязана з устаноўкамі на ідэалагізацыю навукі і іншымі прычынамі. Яшчэ больш яго дыскрэдытавалі шматлікія вульгарызатары і начотнікі. Толькі такі ўзважаны падыход, калі ўлічваецца як станоўчае, так і адмоўнае, можа даць аб'ектыўны малюнак і вызначыць сапраўднае месца ў гісторыі навукі «фальклярыстыкі марксісцкай», якая, па сутнасці, многія дзесяцігоддзі вызначала шлях развіцця ўсходнеславянскай фальклярыстыкі. З пункту ж гледжання тэрміналогіі

---

[8] Азадовский М. К. История русской фольклористики; Чичеров В. И. Вопросы теории и истории народного творчества. М., 1959; Гусев В. Е. Марксизм и русская фольклористика конца XIX—начала XX в. М.; Л., 1961; Путилов Б. Н. В. И. Ленин и фольклористика // СЭ. 1980. № 3.

«фальклярыстыка марксісцкая» абазначае рэальную з'яву з яе характэрнымі асаблівасцямі і межамі.

Рэалізацыя ленінскага тэзіса аб неабходнасці вывучаць фальклор з сацыяльна-палітычнага пункту погляду, патрабаванне ажыццяўляць класавы падыход да розных з'яў мастацтва, у тым ліку і народнага, прывялі да пашырэння даследаванняў ідэйна-тэматычнага зместу народнай творчасці, адлюстравання ў ёй светапогляду працоўных, іх мар і спадзяванняў. Спатрэбіліся і новыя тэрміны, якія б змаглі больш выразна і дакладна адлюстроўваць новыя падыходы да народнай творчасці і новыя яе ацэнкі. Пры гэтым варта прыгадаць, што ідэйная накіраванасць фальклорных твораў прыцягвала ўвагу многіх збіральнікаў, даследчыкаў народнай творчасці, грамадскіх дзеячаў яшчэ ў мінулым стагоддзі. Адмоўнае стаўленне селяніна да служкаў культу і афіцыйнай рэлігіі адзначаў у вядомым лісце да М. В. Гогаля В. Р. Бялінскі, творы падобнага зместу друкаваў за мяжой А. М. Афанасьеў. Фальклорныя творы, накіраваныя супраць прыгнятальнікаў, былі апублікаваны з нагоды 25-й гадавіны скасавання прыгону П. В. Шэйнам [9], а да 50-й гадавіны гэтай даты — Н. Л. Бродскім [10]. У публікацыях яны называліся песнямі пра прыгон («песни о крепостной неволе»), песнямі, што адлюстроўваюць цяжар прыгону («песни, изображающие тяжесть крепостничества»), і г. д. З канца 20-х гадоў побач з гэтымі азначэннямі ўжываюцца і іншыя, накшталт «творы сацыяльнага пратэсту», а затым распаўсюджваецца шэраг тэрмінаў тыпу «антыпрыгонніцкая песня», «антыпрыгонніцкая казка», «антыпапоўская (антыкулацкая) частушка» і г. д. Яны даволі трывала замацаваліся ў фальклярыстычнай літаратуры, асабліва шырока выкарыстоўваліся ў навукова-папулярных артыкулах і зборніках. Па гэтай жа мадэлі пазней утварыліся тэрміны «антыфашысцкі фальклор», «антыфашысцкая песня» і інш., якія аб'ядноўвалі творы, накіраваныя супроць фашызму і фашыстаў, знахопнікаў і акупантаў. Нягледзячы на тое што ўсе гэтыя тэрміны дакладна адлюстроўваюць характэрныя рысы ідэйна-

[9] Шейн П. В. Крепостное право в народных песнях // Русская старина. 1886, февр., кн. 2.

[10] Бродский Н. Л. К воле: Крепостное право в народной поэзии. М., 1911.

тэматычнага зместу фальклорнага твора, сёння яны ўспрымаюцца неадназначна. Асобныя даследчыкі адзначаюць іх вузкасць, прасталінейнасць і шукаюць іншыя азначэнні. За пераглядам тэрміналогіі можна ўбачыць не толькі пошук больш адэкватных і нейтральных заменнікаў, у чым ёсць патрэба, але і спробы пераасэнсаваць фальклорную спадчыну з тых ідэалагічных пазіцый, якія сёння абараняюць розныя партыі і плыні, прыглушыць у ёй крытыку рэлігіі і сацыяльнай няроўнасці, якая ўсё больш адчуваецца ў грамадстве.

Мы спецыяльна засяродзілі ўвагу на звязаных з пэўнай метадалогіяй фалькларыстычных тэрмінах, якія параўнальна нядаўна ўвайшлі ў навуку, а сёння выклікаюць да сябе неадназначныя адносіны. У гэтым праяўляецца дынамічнасць развіцця навуковай думкі, яе гістарычная абумоўленасць. Прымаючы са спадчыны адны тэрміны, адхіляючы другія, удакладняючы трэція, даследчык удасканальвае тэрміналагічны апарат. Разам з тым і прынятыя і адхіленыя тэрміны належаць да гісторыі навукі, і без іх яна будзе няпоўнай, неаб'ектыўнай.

* * *

Праца над Слоўнікам яшчэ раз выявіла ўсю неўпарадкаванасць ужывання класіфікацыйных тэрмінаў. Галоўная прычына такога становішча — нераспрацаванасць агульнатэарэтычных праблем класіфікацыі фальклору, асабліва паняцця «жанр». Класіфікацыйнай тэрміналогіі ў Слоўніку прысвечана некалькі артыкулаў: «Класіфікацыя фальклору», «Род вуснапаэтычнай творчасці», «Жанр фальклорны», «Від фальклору» (аўтар В. Я. Гусеў). Названыя і іншыя артыкулы раскрываюць складанасць праблемы, паказваюць яе сучасны стан, намячаюць шляхі яе вырашэння. У дадатак да сказанага ў артыкулах, якія маюць абмежаваныя памеры, нялішне будзе спыніцца на практыцы ўжывання гэтых тэрмінаў і на тым арсенале, які выкарыстоўвае фальклярыстыка.

Асноўныя агульнатэарэтычныя і класіфікацыйныя паняцці «род», «жанр», «від» прыйшлі ў фальклярыстыку непасрэдна з літаратуразнаўства, дзе ўжыванне іх бадай што ўпарадкавана. Больш складаная сітуацыя з разуменнем і ўжываннем гэтых тэрмінаў утварылася ў фальк-

ларыстыцы, дзе іх яўна не хапае для таго, каб перадаць усе адценні суадносін як паміж рознымі галінамі народнага мастацтва, так і ўнутры іх. Асаблівасці ўжывання класіфікацыйных тэрмінаў залежаць ад многіх фактараў: ад разумення зместу паняцця «фальклор», ад прынцыпаў, на якіх заснавана тая ці іншая яго класіфікацыя, і г. д. Трэба адзначыць, што ва ўсходнеславянскай фальклярыстыцы нямала зроблена для распрацоўкі праблем класіфікацыі фальклору. Важкі ўклад у даследаванне праблемы ўнеслі У. Я. Проп, В. Я. Гусеў і іншыя фальклярысты, якія імкнуліся абгрунтаваць агульныя прынцыпы класіфікацыі, класіфікацыю жанраў, а разам з гэтым і пэўную іерархію класіфікацыйных тэрмінаў. На жаль, праблема застаецца, што пацвярджае практыка. І ў працах названых вышэй аўтараў, і ў даследаваннях беларускіх і ўкраінскіх вучоных сустракаецца нямала класіфікацыйных тэрмінаў ці яшчэ толькі азначэнняў, якія пакуль не сталі тэрмінамі, што ўжываюцца ў самых розных значэннях.

Напрыклад, тэрмін «від» ужываецца ў сэнсе від народнай культуры, адным з якіх з'яўляецца фальклор; ён жа разумеецца як від народнага мастацтва і ў гэтым выпадку ўваходзіць у фальклор як састаўная яго частка (музычнае мастацтва, харэаграфія і г. д.), нарэшце, від успрымаецца як наступная за жанрам (калі ісці зверху ўніз) класіфікацыйная адзінка або, як яе называе В. Я. Гусеў, «першасная ячэйка класіфікацыі» [11].

Цікава прасачыць за ўжываннем класіфікацыйных тэрмінаў як традыцыйных, так і новаўтвораных у грунтоўнай працы У. Я. Пропа «Жанровый состав русского фольклора». Вучоны абмяжоўвае сваё даследаванне найбольш складанымі для такога вывучэння **абласцямі** вуснай народнай творчасці — паэзіяй апавядальнай і лірычнай. **Вобласць** апавядальную аўтар падзяляе на два вялікіх **раздзелы:** на паэзію апавядальную і вершаваную. «Народная проза,— піша У. Я. Проп,— яшчэ не жанр. Проза — адна з абласцей народнай творчасці» [12]. У гэту вобласць уваходзяць розныя **роды** і **віды**. Адзін з такіх **родаў** — казка, у якой можна вылучыць **віды, групы** або **катэгорыі.** Асобны **від**, або **разрад**, складаюць кумуля-

[11] Гусев В. Е. Эстетика фольклора. Л., 1967. С. 110.
[12] Пропп В. Я. Фольклор и действительность. М., 1976. С. 46.

тыўныя казкі. Да асобнага **разраду** адносіць даследчык казкі пра жывёл. Таксама асобны **від** казачнага эпасу складаюць небыліцы, а анекдот — **разнавіднасць** казак пра людзей.

Падзяліўшы такім чынам матэрыял, У. Я. Проп вылучае з гэтых розных па суадносінах паміж сабой катэгорый жанры казкі, да якіх адносіць «казкі чарадзейныя, кумулятыўныя, пра жывёл, аб прадметах і стыхіях, бытавыя казкі пра людзей, небыліцы і дакучныя казкі» [13]. Не кранаючы пытання аб сутнасці і правамернасці менавіта такой жанравай класіфікацыі казкі, мы зараз імкнёмся прасачыць паслядоўнасць ужывання класіфікацыйных тэрмінаў, захаванне за імі пэўнай іерархіі. Сам аўтар уяўляе яе наступным чынам: «Жанр — гэта адно са звенняў класіфікацыі. Лірычная, драматычная, эпічная паэзія — гэта роды народнай творчасці. Роды можна падзяліць на вобласці. Так, эпіка дзеліцца на вобласць эпічнай прозы і эпічнай вершаванай паэзіі. Вобласці дзеляцца на віды. Казка адносіцца да вобласці народнай прозы, гэта адзін з відаў яе. Гэты від распадаецца на казкі чарадзейныя, кумулятыўныя, пра жывёл, пра людзей і г. д. Гэта — жанры. У якасці далейшага больш вузкага тэрміна можна прапанаваць слова «тып»: тыпы распадаюцца на сюжэты, сюжэты — на версіі і варыянты» [14]. Такім чынам, атрымалася наступная схема: вуснапаэтычная творчасць (фальклор) — род—вобласць—від—жанр — тып — сюжэт — версія — варыянт. Яна пабудавана на матэрыяле апавядальных эпічных твораў і ўключае новыя для класіфікацыі тэрміны «вобласць», «тып». Разглядаючы іншыя роды і віды народнай паэзіі, У. Я. Проп не абмежаваўся гэтымі класіфікацыйнымі катэгорыямі. У былінах, якія даследчык лічыць асобным відам, ён вылучае **сюжэтныя групы**, а затым ідэнтыфікуе іх з жанрамі: былiны гераічныя, казачныя і навелістычныя. У класіфікацыі балад ужыты яшчэ адзін тэрмін — «цыкл». Адзін цыкл аб'ядноўвае балады сямейнага і любоўнага зместу, другі «заснаваны на доўгай адсутнасці аднаго з членаў сям'і», трэці складаюць творы, якія «можна назваць баладамі гістарычнымі». Але балады — адзіны жанр, і таму роз-

[13] Пропп В. Я. Фольклор и действительность. С. 50.
[14] Там жа.

ніцу паміж баладамі сямейнымі аб непазнаных сустрэчах і так званымі гістарычнымі У. Я. Проп разглядае як розніцу тыпаў, а не жанраў. У гэтым выпадку тэрмін «тып» ужыты як эквівалент «цыкла». Блізкае значэнне набываюць тэрміны «від» і «жанр» пры разглядзе гістарычных песень, а пры разглядзе лірычных песень у **жанры** нячастых вылучаецца больш дробная адзінка — **від** працяжных. Прыкладна такое ж значэнне пры разглядзе лірычных песень набывае тэрмін «разнавіднасць».

Як бачым, для класіфікацыі фальклору недастаткова трох традыцыйных тэрмінаў «род», «від», «жанр», і У. Я. Проп уводзіць новыя. Але калі ў яго тэрміналогія мае пэўную сістэму, адступленні ад якой нязначныя, то ў іншых даследаваннях гэтыя і іншыя тэрміны набываюць самыя разнастайныя значэнні. Як адзначаў даследчык, «няўменне адрозніць род і від, а таксама ўжываць больш шырокія і больш вузкія разрады класіфікацыі наогул сустракаюцца вельмі часта. Можна сказаць, што такі спосаб размеркавання ў нас пануе. Матэрыял падзяляецца на разрады без далейшых падраздзяленняў або разгалінаванняў, пры гэтым у адзін рад трапляюць з'явы вельмі шырокага і вельмі вузкага характару. Атрымліваецца пералік без усякіх падраздзяленняў, без разгалінаванняў. Між тым многіх памылак магчыма было б пазбегнуць, калі ўжываць адны прыкметы для разрадаў, другія — для падразрадаў замест таго, каб сумяшчаць іх у адным шэрагу, дзе яны не выключаюць адзін аднаго» [15].

Больш дробны класіфікацыйны падзел фальклорнага матэрыялу прапаноўвае і В. Я. Гусеў, які лічыць, што класіфікацыя фальклору не можа абмежавацца падзелам толькі на роды, яна павінна прадугледзець і прамежкавыя, пераходныя формы [16]. Ён зыходзіць з таго, што фальклор аб'ядноўвае поліэлементныя віды мастацтва, і таму падзел, прыняты для аднаэлементнага мастацтва як, напрыклад, літаратура, у дадзеным выпадку непрымальны. «Другім дзяленнем у агульнай класіфікацыі фальклору,— піша вучоны,— павінна быць размеркаванне жанраў у разрады або групы па сродках мастац-

---

[15] Пропп В. Я. Фольклор и действительность. С. 65.
[16] Гусев В. Е. Эстетика фольклора. С. 105.

кай выяўленчасці, па характару камбінацыі гэтых сродкаў»[17]. Так, у эпічным родзе трэба вылучыць апавядальныя жанры, у якіх спалучаюцца слова і міміка, і песенныя жанры са спалучэннем слова і музыкі. У гэтай першай групе (апавядальныя жанры) даследчык вылучае дзве падгрупы, сярод якіх «уласна апавядальныя жанры» зноў-такі падзяляюцца на казачную і няказачную прозу. У падгрупе «прасцейшыя эпічныя жанры» (прыказкі, прымаўкі, загадкі) даследчык лічыць магчымым вылучыць не толькі тэматычныя групы ў кожным з жанраў, але і ўнутрыжанравыя віды[18]. У канчатковым выглядзе класіфікацыйная схема, прапанаваная В. Я. Гусевым, мае наступныя пазіцыі: род і яго пераходныя формы (напрыклад, лірыка-эпічныя) — група—жанр—від.

Не кранаючы сутнасці класіфікацыі, у якой даследчык паслядоўна праводзіць эстэтычны прынцып, мы хацелі б адзначыць, што з тэрміналагічнага боку тут ёсць пэўныя разыходжанні са схемай і наменклатурай У. Я. Пропа, класіфікацыя якога абапіраецца на вуснапаэтычную творчасць і мае філалагічны напрамак. Звернемся і да іншых прац, дзе закранаюцца праблемы класіфікацыі фальклору, каб агульны малюнак паўней адлюстроўваў увесь спектр ужывання класіфікацыйнай тэрміналогіі. У класіфікацыі традыцыйнай сялянскай бытавой песні Н. П. Калпакова ўжывае тэрмін «цыкл» («каляндарны цыкл»), але лічыць яго недакладным. Асноўнымі ў яе схеме з'яўляюцца «жанр, які распадаецца на некалькі **відаў**», «разнавіднасць», «група»[19]. Т. М. Акімава, даследуючы жанравую прыроду рускіх «удалых» песень, вылучае іх як асобны **жанр**, які ў сваю чаргу можа быць падзелены на тры **віды**[20]. Даследчыкі беларускага фальклору побач з тэрмінамі «род», «жанр», «від» ужываюць таксама азначэнні «жанравая разнавіднасць», «цыкл», «фальклорна-этнаграфічны комплекс».

Такім чынам, у распараджэнні даследчыка, які класіфікуе фальклорны матэрыял, ёсць наступныя тэрміны:

---

[17] Гусев В. Е. Эстетика фольклора. С. 105.

[18] Там жа. С. 113.

[19] Колпакова Н. П. Опыт классификации традиционной крестьянской бытовой песни // Русский фольклор. М.; Л., 1960. Т. 5. С. 167—182.

[20] Акимова Т. М. О жанровой природе русских «удалых» песен // Там жа. С. 183—199.

«род», «вобласць», «від», «жанр», «тып», «сюжэт», «версія», «варыянт», «група», «катэгорыя», «разрад», «разнавіднасць», «цыкл», «падгрупа», «жанравая разнавіднасць». Але, як ужо было адзначана, ва ўжыванні класіфікацыйнай тэрміналогіі назіраецца адвольнасць, непаслядоўнасць не толькі ў розных аўтараў, а нават у аднаго і таго ж, не выпрацавана супадпарадкаванасць тэрмінаў. Да таго ж і самі тэрміны неаднолькава трывала звязаны з тым матэрыялам, які падлягае класіфікацыі. Калі род, від, жанр, жанравая разнавіднасць традыцыйна абазначаюць пэўныя эстэтычныя, мастацтвазнаўчыя катэгорыі, то вобласць, група, падгрупа, катэгорыя яшчэ не набылі адпаведнага спецыфічна фальклярыстычнага напаўнення, пэўнай устойлівасці, і таму амплітуда прымянення кожнага з іх вялікая: ад верхніх прыступак класіфікацыйнай лесвіцы да ніжніх.

Аднак пры ўсёй нестабільнасці класіфікацыйнай сістэмы фальклору і неўпарадкаванасці ўжывання тэрміналогіі можна акрэсліць пэўныя тэндэнцыі, замацаванне і развіццё якіх разам з тэарэтычнай распрацоўкай шматлікіх дыскусійных праблем класіфікацыі будзе садзейнічаць паступоваму ўсталяванню агульных норм у гэтай справе.

Як можна было заўважыць, тыя даследчыкі, якія ўспрымаюць фальклор не толькі як вуснапаэтычную творчасць, а значна шырэй, як сукупнасць паэтычнага, музычнага, харэаграфічнага, драматычнага народнага мастацтва, шукалі і шукаюць тэрміны для агульнай назвы частак гэтай сукупнасці. Найбольш часта ў такіх выпадках размова ідзе пра від народнага мастацтва — паэтычны, музычны і г. д. Але тэрмін «від» ужываецца таксама і як больш дробная класіфікацыйная адзінка — перад жанрам або пасля яго і на гэтых пазіцыях замацаваўся даволі трывала, таму, на наш погляд, больш мэтазгодна звярнуцца да другога тэрміна, які таксама ўжываўся ў гэтым значэнні — «область народного искусства», «галіна народнага мастацтва». Кожная з гэтых абласцей, або галін, мае сваю ўстойлівую назву, якая ўжываецца як самастойны тэрмін — «вуснапаэтычная творчасць», «музычны фальклор» і г. д. Звяртаючыся да канкрэтнай галіны — вуснапаэтычнай творчасці, аб якой у асноўным і вядзецца тут гутарка, можна адзначыць, што ва ўсіх класіфікацыйных схемах верхнюю пры-

ступку займае род — эпічны, драматычны, лірычны, а ў многіх выпадках і яго пераходныя формы — лірыка-эпічныя, лірыка-драматычныя, эпіка-драматычныя.

Паміж родам і жанрам як асноўнымі класіфікацыйнымі ступенямі звычайна ўводзіцца яшчэ адна ці нават больш ступеняў. Як адзначалася, У. Я. Проп у гэтым выпадку карыстаецца тэрмінамі «вобласць» (эпічная проза і эпічная паэзія — вобласці) і «від» (казка—від, які падзяляецца на жанры). В. Я. Гусеў у агульнай эстэтычнай класіфікацыі твораў фальклору паміж родам і жанрам уводзіць катэгорыю «група», якая адпавядае тэрміну У. Я. Пропа «вобласць»: у эпічным родзе ён вылучае дзве групы — «словесную», куды ўключаюцца казкі, легенды, паданні, анекдоты і інш., і «словесно-музыкальную» — эпічная песня.

Сапраўды, гэта класіфікацыйная ступень вельмі патрэбна для ўпарадкавання фальклорнага — вуснапаэтычнага — матэрыялу. У эпічным родзе вылучаюцца вершаваныя і празаічныя жанры, сярод апошніх — жанры казачнай і няказачнай прозы; у лірыцы — абрадавыя і пазаабрадавыя творы; драматычны род таксама можна падзяліць на жанры гульнёва-карагодныя і ўласна драматычныя і г. д. Па сутнасці, перад намі **групы** жанраў пэўных родаў, аднак тэрмін «група», які прапаноўваў В. Я. Гусеў, на наш погляд, не вельмі ўдалы. Ён аморфны, недакладны, з аднолькавым поспехам можа быць аднесены да самых разнастайных груп, аб'яднаных на падставе жанравай, тэматычнай, вобразнай і інш. агульнасці, і патрабуе дадатковых азначэнняў. У дадзеным выпадку, пры адсутнасці больш дакладнага азначэння, можна было б гаварыць пра «міжжанравыя групы», улічваючы, што амаль кожная з гэтых груп мае сваё найменне.

Наступнай класіфікацыйнай адзінкай павінен быць **жанр**, хаця некаторыя даследчыкі прапануюць яшчэ ўвесці тэрмін «від», маючы на ўвазе, што песня, казка — не жанр, а сукупнасць жанраў. Мы прытрымліваемся выказанага ў Слоўніку погляду, адпаведна якому якраз жанр павінен быць пастаўлены вышэй за від, што і казка і песня — гэта жанры, кожны з якіх характарызуецца агульнасцю найбольш істотных рыс паэтычнай сістэмы, бытавога прызначэння, форм выканання і, што таксама вельмі важна, успрымаецца народным асяроддзем як

нешта цэласнае, адзінае, якое пры ўсёй разнастайнасці зместу, асаблівасцях мастацкай формы мае пэўныя агульныя рысы, адну агульную назву: «казка», «песня». Унутры гэтых і іншых жанраў вылучаюцца віды (чарадзейная казка, сацыяльна-бытавая песня); наступнай класіфікацыйнай катэгорыяй можа быць жанравая разнавіднасць, калі размова ідзе аб невялікіх адрозненнях, што датычаць спецыфічных рыс жанру (батрацкія, чумацкія песні — жанравыя разнавіднасці сацыяльна-бытавых песень).

Пэўную спецыфіку мае класіфікацыя абрадавай паэзіі, якая ўключае ў сябе творы розных жанраў і відаў і мае акрэсленую функцыянальную прызначанасць. Ва ўсходнеславянскай фальклярыстыцы трывала замацаваўся класіфікацыйны тэрмін «цыкл» у дачыненні да каляндарнай абрадавай паэзіі, якая ў залежнасці ад поглядаў даследчыкаў падзяляецца на два, тры ці чатыры цыклы. Прыняты ў Слоўніку падзел каляндарна-абрадавай паэзіі вылучае чатыры цыклы: зімовы, веснавы, летні і восеньскі. У дадзеным выпадку тэрмін «цыкл» мае, калі можна так сказаць, наджанравы або міжжанравы характар, аб'ядноўваючы творы розных жанраў і відаў: песні велічальныя, заклінальныя, жартоўныя, прыгаворы, рацэі і інш. Калі ў дачыненні да каляндарна-абрадавай паэзіі тэрмін мае канкрэтны сэнс і акрэсленыя межы, у іншых выпадках ён ужываецца адвольна ў дачыненні да з'яў розных узроўняў.

Агляд змешчанай у Слоўніку класіфікацыйнай тэрміналогіі падкрэслівае неабходнасць яе далейшай уніфікацыі і, галоўнае, тэарэтычных распрацовак не толькі ключавых класіфікацыйных паняццяў, але і таго першаснага матэрыялу, які складае аснову кожнай класіфікацыйнай сістэмы. Разам з гэтым выяўленыя і замацаваныя ў Слоўніку тэндэнцыі фарміравання пэўнага супадпарадкавання класіфікацыйных тэрмінаў пры неабходнай карэкціроўцы маглі б быць ужо сёння ўнармаваны ў даследчай практыцы.

* * *

Праца над Слоўнікам дазволіла правесці своеасаблівую рэвізію ўсіх тых сапраўды незлічоных багаццяў народнай творчасці ўсходніх славян, якія бадай што ніко-

лі не былі прадстаўлены ў такім аб'ёме ў адным якім-небудзь спецыяльным даследаванні або ў класіфікацыйнай сістэме. Асабліва выразна гэта відаць на прыкладзе песеннай творчасці, дакладней — на яе тэрміналогіі. Толькі ў асноўны корпус Слоўніка было ўведзена каля 200 тэрмінаў, якія з розных бакоў характарызуюць песенную творчасць усходніх славян. Па свайму аб'ёму і іншых параметрах гэтыя тэрміны нераўназначныя. Адны з іх ахопліваюць абрадавую песенную творчасць і яе цыклы: «песня абрадавая», «песня каляндарна-абрадавая»; другія супадаюць з відам: «песня жартоўная», «працоўная», «сацыяльна-бытавая» і інш.; трэція адлюстроўваюць больш дробны падзел, які ўжываецца ў навуковых даследаваннях («песня паланянак», «разбойніцкая» і г. д.), а таксама ў народнай класіфікацыі («доўгая», «крутуха», паджытняя» і г. д.).

І ў навуковай, і ў народнай тэрміналогіі адлюстраваны самыя разнастайныя падыходы ў вызначэнні прыналежнасці песень да пэўных класіфікацыйных катэгорый або груп. Значная колькасць тэрмінаў, у большасці тых, што ўжываюцца ў навуковай літаратуры, падкрэслівае ідэйна-тэматычны змест песень або іх прыналежнасць да пэўных сацыяльных і іншых груп насельніцтва. Гэта адыходніцкая, антыклерыкальная, бурлацкая, бурсацкая, гайдамацкая, жабрацкая, казацкая, лірніцкая, опришківська, партызанская, прымацкая, турэмная, шахцёрская, студэнцкая і іншыя песні. Кожная з іх нясе адбітак таго асяроддзя, у якім узнікла і бытавала: асаблівасцей жыцця, спосабу існавання, працы, светапогляду і г. д. Адсюль і тое шматквецце паэтычных сродкаў і тая неаднолькавасць, часам палярнасць ацэнак рэчаіснасці, выказаных у творах. Побач з антыклерыкальнымі песнямі шырока бытавалі ва ўсходнеславянскім фальклоры супрацьлеглыя ім па ідэйнаму зместу песні паставыя, або «святыя»; побач з антыпрыгонніцкімі спявалі духоўныя вершы, у якіх сацыяльныя канфлікты пераводзіліся ў маральны план.

Песенная тэрміналогія ўсходніх славян падкрэслівае моцную сувязь народнай творчасці з працай, пераважна сельскагаспадарчай — земляробчай. З працоўным календаром непарыўна звязана ўся каляндарная абрадавая паэзія. Але і многія іншыя групы песеннай творчасці канцэнтруюцца вакол пэўных сельскагаспадарчых

работ, хаця ў абрады не ўваходзілі. У большасці выпадкаў такая сувязь вызначаецца тэрмінамі выканання або тэматыкай, якая ў нейкай ступені адпавядае гэтай працы. Я маю на ўвазе песні сенакосныя, касарскія, гребовицькі, ільняныя, палольныя, або полільницьки, стругаўскія, талочныя і інш.

У навуковай і народнай тэрміналогіі адлюстраваны таксама і асаблівасці выканання песень, іх функцыянальнае прызначэнне, што, бясспрэчна, бярэцца пад увагу пры іх жанравай класіфікацыі. Гэта песні доўгая, працяжная, галосная і скорая, частая, хуткая; наборная і разборная; бяседная. Апошні народны тэрмін вельмі ёмкі і мае шмат сінонімаў. Ён аб'ядноўвае песні, не звязаныя з абрадамі, якія могуць выконвацца ў любой бяседзе. Па сутнасці, гэта ўся пазаабрадавая лірыка. На тое, што тэрмін аб'ядноўвае песні, не рэгламентаваныя часам выканання, указвае яго сінонім «абы-калі». Іншыя назвы — «банкетовая», «гасцявая», «карчомная», «на вячорках» — падкрэсліваюць розныя акалічнасці, у большасці звязаныя з застоллем, калі выконваюцца гэтыя песні. Нягледзячы на пэўную неакрэсленасць тэрміна і яго сінонімаў, не заўсёды дакладных, ён вельмі часта сустракаецца ў практыцы палявых даследаванняў. Аналізуючы тэкст і мелодыю, у гэтай міжжанравай групе песень можна вылучыць і жартоўныя, і сямейна-бытавыя, і любоўныя, і баладныя, і іншыя творы, якія адпавядаюць настрою і складу ўдзельнікаў канкрэтнай «бяседы»; калі ў ёй пераважаюць мужчыны, тут гучаць і салдацкія, і рэкруцкія, і іншыя сацыяльна-бытавыя песні.

Сабраная разам тэрміналогія народнай песні ўсходніх славян падкрэслівае агульнасць іх песнятворчасці па ўсіх асноўных параметрах і разам з тым дазваляе заўважыць рысы адметнасці ў агульных для трох народаў з'явах. Асабліва яскрава гэта праявілася ў каляндарнай абрадавай паэзіі. Сярод песень зімовага цыкла адзначаны калядныя, шчадроўкі, падблюдныя, вінаграддзі, аўсень (таўсень), цярэшкі, засявалкі і інш. Розніца ў тэрміналогіі адлюстроўвае і некаторыя асаблівасці як у абрадах зімовага цыкла, так і ў песенным рэпертуары. Калядка як тэрмін і як пэўны тып велічальнай песні вядома ўсім славянам; шчадроўка больш вядома на Украіне і Беларусі, прычым розніца паміж калядкамі як тво-

рамі, што прымеркаваны да свята нараджэння Хрыста, і шчадроўкамі як песнямі навагоднімі больш усведамлялася на Украіне; засявалкі — песенькі, якімі суправаджаецца «засяванне» на Новы год, таксама прадстаўлены ва ўкраінскім і беларускім фальклоры. У той жа час песні падблюдныя, вінаграддзі, аўсені звязаны з рускай фальклорнай традыцыяй, хаця маюць шмат агульных рыс з усім усходнеславянскім зімовым фальклорна-этнаграфічным комплексам [21]. Вядомая славянам навагодняя варажба набыла тут сваю адметнасць, што замацавана і самім абрадам і падблюднымі песнямі. Пэўную лакалізацыю маюць велічальныя песні — вінаграддзі і аўсені. Першыя, па назіраннях У. І. Чычарава, больш уласцівыя для паўночных раёнаў (тэрыторыі наўгародскай каланізацыі), другія — для раёнаў навокал Масквы, Уладзіміра, Ніжняга Ноўгарада, Разані [22]. Таксама свой арэал бытавання маюць беларускія «цярэшкі» — адметная з'ява ў фальклоры ўсходніх славян.

Яшчэ больш насычаны малюнак стварае ўсходнеславянская песенная тэрміналогія веснавога цыкла. Гэта абумоўлена і багаццем самой паэзіі, і значнай колькасцю лакальных з'яў, і неадэкватнай трактоўкай шэрагу агульных тэрмінаў, і іншымі прычынамі. Вось асноўныя назвы песень гэтага цыкла: «вясенняя», «веснавая», «вяснянка», «валачобная», «вьюнишная», «гаївка», «грянаая», «гуканне» («гуканка»), «куставая», «русальная», «риндзівка», «рогулька», «семиковая», «страла», «троіцкая», «таполя», «юрьевская» і інш.

Песня «весенняя», «веснавая» — тэрмін абагульняючага характару, аб'ядноўвае ўсе абрадавыя песні веснавога цыкла, пачынаючы ад гукання вясны і да Тройцы. Блізкі да яго тэрмін «вяснянка» ў беларускай і рускай песеннай традыцыі адносіцца да песень, якімі заклікалі вясну — да заклічак, гуканняў, што выконваліся звычайна ў залежнасці ад мясцовых традыцый на Еўдакію, на Саракі або на Звеставанне (1, 9, 25 сакавіка). У заходніх раёнах Палесся — Беларускага і Украінскага — вяснянкі мелі яшчэ назву «рагулькі». Ва ўкраінскай традыцыі пад вяснянкай разумеецца больш шырокае кола песень,

---

[21] Виноградова Л. Н. Зимняя календарная поэзия западных и восточных славян. М., 1982.

[22] Чичеров В. И. Зимний период русского народного земледельческого календаря XVI—XIX веков. М., 1957.

прымеркаваных да розных абрадаў, пачынаючы ад ранняй вясны і да «зялёных свят». Па сутнасці, тут тэрмін «вяснянка» супадае па зместу з тэрмінам «песня веснавая». Як адзначаюць украінскія даследчыкі (Н. С. Шумада), у заходніх абласцях Украіны такое ж шырокае значэнне набыў тэрмін «гаївка» (мясцовыя назвы «гаїлка», «галагілка», «лаголойка», «маївка»), дзе ён можа ўжывацца як сінонім агульнаўкраінскага «веснянка». Адначасова заўважаецца, што гаївкі ў асноўным канцэнтруюцца вакол велікодных свят і таму вядомы яшчэ пад назвай «великодні пісні». У заходніх абласцях Украіны вядомы былі таксама велічальныя па сваіх функцыях песні — риндзівки, якія выконвалі ў час велікодных свят маладыя хлопцы (парубкі) у гонар дзяўчат і маладых жанчын, за што атрымлівалі пачастунак, грошы.

У беларусаў на Вялікдзень у час традыцыйных абходаў валачобнікаў спяваліся велічальныя песні, якія называюцца валачобнымі. Валачобныя песні — адметная з'ява ў фальклоры ўсходніх славян, вядомы на этнічнай тэрыторыі беларусаў і ў некаторых прымежных з ёй раёнах Расіі і Украіны.

У рускай фальклорнай традыцыі на велікодныя святы таксама існавалі песні, якія суправаджалі абходы двароў,— вьюнишные, але і па часу выканання, і па адрасатах, і па зместу яны істотна адрозніваюцца ад валачобных. Калі валачобныя песні выконваліся на першы дзень Вялікадня і маглі быць адрасаваны як усёй сям'і, так і кожнаму з яе членаў, песні вьюнишные спявалі ў суботу або нядзелю паслявелікоднага тыдня і адрасавалі маладым, якія пабраліся мінулай зімой. Традыцыя віншавання маладых існавала таксама ў беларусаў і ўкраінцаў, але ў іх падобныя абходы з выкананнем песень былі прымеркаваны да Масленіцы (шырокага чацвярга) і складалі частку масленічнага цыкла, а песні мелі іншыя назвы: «масленічныя», «маслянка», «запусныя».

Наступная група веснавых песень усходніх славян звязана са святам у гонар св. Георгія, апекуна земляробства і жывёлагадоўлі (23 красавіка), і называецца юраўскімі, або егорьевскими. Тут таксама былі некаторыя рэгіянальныя адрозненні ў дэталях абраду і песнях, хаця ў тэрміналогіі амаль паўсюдна замацаваліся прыведзеныя назвы. У многіх рэгіёнах да Юр'я прымяркоў-

ваўся першы выган на пашу жывёлы, які суправаджаўся рознымі магічнымі дзеяннямі. Юраўскія песні, вядомыя ўсім усходнім славянам, найлепш захаваліся ў беларусаў. Асноўныя іх матывы — адмыканне зямлі, расы, клопат Юр'я пра ўраджай, пра хатнюю жывёлу і інш. Як адзначалі даследчыкі, у асобных раёнах Беларусі юраўскія песні выконвалі як абходныя (юраўскае валачобніцтва на Гродзеншчыне).

Своеасаблівыя абрады і песні на Юр'я зафіксаваны ва Украінскіх Карпатах. Мелодыя гэтых песень такая ж, як і вясельных урачыста-элегічных песень — ладканак, таму яны і атрымалі назву «пастуші ладканки» ў адпаведнасці з народнай тэрміналогіяй: «ладканки для худоби», «ладканка до корови», «ладкати худобі» [23].

Багаццем тэрміналогіі і разнастайнасцю вылучаюцца песні заключнага перыяду веснавога цыкла, цэнтрам якога можна лічыць Тройцу. У гэты час спяваюць «стралу», «таполю», «куст», сяміковыя, траецкія, граныя, русальныя і іншыя песні. Адны з іх вядомыя ўсім усходнім славянам, іншыя адносяцца да лакальных з'яў. Так, напрыклад, на Ушэсце — у чацвер шостага тыдня ад Вялікадня — у паўднёва-ўсходніх раёнах Беларусі выконваўся абрад «пахавання стралы», які павінен быў засцерагчы ад маланкі. Цэнтральнай часткай абраду з'яўляўся карагод «Страла». Песні, карагоды і ўвесь абрадавы фальклорна-этнаграфічны комплекс мелі назвы «пахаванне стралы», «ваджэнне стралы» або проста «страла».

Праз тыдзень пасля Ушэсця святкавалі Сёмуху, а затым у нядзелю — Тройцу, і кожнае з абрадавых дзеянняў гэтых свят суправаджалася песнямі сёмушнымі (семиковыми) і траецкімі. У сувязі з тым што абрады і на Сёмуху і на Тройцу мелі шмат агульнага, былі накіраваны на ўшанаванне раслiннасці, песні сёмушныя і траецкія практычна не адрозніваюцца, хаця маюць розныя назвы. У гэтых песнях услаўляецца бяроза, упамінаецца рытуальная ежа, кумленне і іншыя элементы свята.

У траецкі комплекс уваходзяць русальныя, або граныя, песні, адным з цэнтральных вобразаў якіх з'яўляецца вобраз русалкі. Больш трывала ў народнай памяці ўсходніх славян захоўваюцца ўяўленні аб русалках

[23] Кирчів Р. Ф. Релікти Юріївської обрядовості в Українських Карпатах // Народна творчість та етнографія. 1985. № 2. С. 38—43.

як аб істотах, сустрэча з якімі можа быць небяспечнай; на асобных тэрыторыях (напрыклад, Цэнтральнае і Усходняе Палессе) захаваліся абрады «провадаў русалкі» і русальныя (граныя) песні, якія суправаджалі гэты абрад («Правяду русалачку да бору»).

Акрамя адзначаных вышэй мясцовых асаблівасцей веснавых абрадаў, свят і песень і звязанай з імі тэрміналогіі неабходна ўпамянуць яшчэ такія лакальныя фальклорна-этнаграфічныя комплексы, як «куст», «таполя», «пахаванне кукушкі», прымеркаваныя да Тройцы. Абрад «вадзіць куста» зафіксаваны на параўнальна невялікай тэрыторыі Беларускага Палесся (Пінскі, Іванаўскі, Столінскі р-ны) і ў Дубровіцкім раёне Ровенскай вобласці Украіны (в. Сварыцэвічы). «Куст» — прыбраная зялёнымі галінкамі дзяўчына — ідзе на чале «дзявоцкага войска» па вёсцы з традыцыйным аграрна-магічным абходам хат. Песні, якія пры гэтым выконваюцца, называюць тут куставымі («на куста», «спяваці куста») або «трыйца» («троица»), але ад уласна траецкіх, аб якіх ішла гаворка вышэй, яны адрозніваюцца зместам, вобразамі (Куст, дзявоцкае войска, цудоўнае дрэва і інш.) і вылучаюцца ў асобны від веснавой паэзіі.

У тэрміналогіі каляндарна-абрадавых песень усходніх славян зафіксавана нямала іншых з'яў, якія адлюстроўваюць як агульныя рысы, так і асаблівасці іх песеннай культуры, народнай класіфікацыі тых або іншых песень, песенных цыклаў. У беларускай і ўкраінскай фальклорнай традыцыі існуе абагульняючы тэрмін «лета», «літо», «спяваць лета», які аб'ядноўвае песні летняга цыкла, уключаючы сюды і жніўныя. Гэта народная класіфікацыя можа быць важкім аргументам на карысць тых даследчыкаў каляндарна-абрадавай паэзіі ўсходніх славян, якія падзяляюць яе на чатыры цыклы, а жніўныя песні, выключаючы песні ярынныя (жніва яравых), адносяць да летніх.

Народная тэрміналогія вельмі чуйна рэагуе на асаблівасці мясцовай абраднасці, яе структуру і на змест песень, звязаных з асобнымі элементамі абраду. Так, з агульнага масіву летніх (купальскіх) песень народная традыцыя паўночна-заходняй часткі Беларусі вылучае паджытнія песні. Яны суправаджалі традыцыйны абрад «хадзіць пад жыта», ад якога і атрымалі назву.

Як можна заўважыць, змешчаная ў Слоўніку тэрмі-

налогія народнай песні стварае шматколерную палітру народнай песнятворчасці, у якой выразна абазначаны разнастайныя адценні і нюансы як этнічнага, так і жанравага характару. Становіцца відавочнай карыснасць далейшага вывучэння тэрміналогіі і з'яў, якія за ёй стаяць. Асабліва плённым можа быць далейшы пошук у галіне народнай тэрміналогіі, якая ў многіх выпадках з'яўляецца ключом для высвятлення рэгіянальных асаблівасцей фальклору і яго параўнальнага вывучэння.

У дакладзе мы спыніліся на трох групах тэрмінаў, якія тычацца агульнатэарэтычных праблем, праблем класіфікацыі і характарыстыкі песеннай творчасці ўсходніх славян. У кожнай з гэтых груп, а іх можна вылучыць значна больш, былі акрэслены нявырашаныя або дыскусійныя пытанні, на якія хацелася б звярнуць увагу. Як было адзначана, адной з асноўных крыніц даклада з'яўляецца калектыўная праца «Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии» — першая ва ўсходнеславянскай навуцы спроба стварэння падобнага выдання. Першай спробай абагульнення зробленага з'яўляецца і гэты даклад.

РЕЗЮМЕ

В докладе в сравнительном плане рассматриваются три группы восточнославянской фольклористической терминологии — термины общетеоретического характера, классификационные и термины, относящиеся к песенному творчеству восточных славян. Выявлены особенности употребления ряда терминов в каждой национальной научной традиции, их неоднозначное толкование, характеризуются термины, возникшие в восточнославянской фольклористике за последние 70 лет.

Особое внимание уделено терминологии, относящейся к песенным жанрам, в которой отразились жанровые и этнические особенности фольклора восточных славян.

Навуковае выданне

Мінск, выдавецтва «Навука і тэхніка»

КАБАШНІКАЎ КАНСТАНЦІН ПАЎЛАВІЧ

НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ ТЭРМІНАЛОГІІ УСХОДНЕСЛАВЯНСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ

Здадзена ў набр 10.06.93. Падпісана ў друк 07.07.93. Фармат 84×108 1/32. Папера газетная. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 1,68. Ум. фарб.-адб. 1,79. Ул.-выд. арк. 1,49. Тыраж 230 экз. Зак. № 646. Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук Беларусі і Дзяржаўнага камітэта па друку Рэспублікі Беларусь. 220141. Мінск, Жодзінская, 18. ЛВ № 437. Друкарня імя Францыска Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220141. Мінск, Жодзінская, 18.